**І.М. Саніковіч**

# ПРАБЛЕМА СТВАРЭННЯ ІНТЭГРАВАНАЙ СІСТЭМЫ НАВУЧАННЯ ШКОЛЬНІКАЎ (VIII–X КЛАСЫ) НАПІСАННЮ САЧЫНЕННЯЎ-РАЗВАЖАННЯЎ

Развіццё мовы і маўлення вучняў з'яўляецца асноўнай ідэяй курса роднай мовы ў школе. У адносінах да методыкі навучання роднай мовы пад паняццем "развіццё мовы" разумеецца такая арганізацыя "аналітыка-сінтэтычнай моўнай і практычнай маўленчай дзейнасці, якая з дапамогай дыдактычных сродкаў садзейнічае мэтанакіраванаму развіццю інтэлектуальных маўленчых механізмаў дзяцей і падлеткаў і выпрацоўцы нормаў літаратурнага вымаўлення і правапісу, стымулюе ўзбагачэнне слоўніка і граматычнага ладу мовы вучня, фарміруе ўменне ўспрымаць і **ствараць звязныя тэксты,** разнастайныя па стылістычнай і жанравай прыналежнасці, структурна-моўнай арганізацыі, мэтанакіраванасці, паўнаце і дакладнасці выражэння думкі" [2, с. 84]. Паколькі сачыненне з'яўляецца практыкаваннем па выпрацоўцы і развіццю навыкаў звязнага пісьмовага маўлення, праблема навучання школьнікаў іх стварэнню працягвае заставацца актуальнай і на сучасным этапе развіцця методыкі выкладання мовы.

Найбольшыя **цяжкасці ў вучняў узнікаюць пад час напісання сачыненняў-разважанняў**. Гэта, на наш погляд, тлумачыцца **наступнымі прычынамі**:

- недастатковасцю тэарэтычнага матэрыялу, які б даваў больш глыбокае ўяўленне аб кампазіцыі тэкста-разважання, яго састаўных элементах, відах доказу;
- няўменнем выкарыстоўваць атрыманыя веды на практыцы, што тлумачыцца недастаткова сфарміраваным навыкам ствараць тэксты-разважанні і адсутнасцю сістэматычнасці ў яго фарміраванні.

Для стварэння тэарэтычных асноў сачынення-разважання неабходна, на наш погляд, **улічваць у гэтым пытанні дасягненні такіх навуковых дысцыплін, як рыторыка і логіка.** Гэта тлумачыцца **наступнымі прычынамі.**

Па-першае, рыторыка сярод іншых раздзелаў уключае ў сябе:

- знаходжанне (вызначэнне зместу будучага тэксту, падбор доказаў, фактаў, цытат і г. д.);
- размяшчэнне (сістэматызацыя фактычнага матэрыялу, распрацоўка пытанняў кампазіцыі);

- слоўнае выражэнне (выкарыстанне моўных сродкаў – тропаў і стылістычных фігур у адпаведнасці са зместам тэксту).

Менавіта ў гэтых раздзелах можна знайсці адказы на пытанні: *што? у якой паслядоўнасці? як пісаць?*, якія з’яўляюцца актуальнымі пад час стварэння тэксту любога тыпу, жанру і стылю, у тым ліку і пісьмовага разважання на пэўную тэму.

Па-другое, сама гісторыя ўзнікнення і развіцця методыкі навучання напісанню сачыненняў-разважанняў сведчыць, што найбольш поўна тэарэтычныя асновы будавання тэкстаў дадзенага тыпу былі распрацаваны ў рэчышчы такіх дысцыплін, як логіка і рыторыка (гл. “Краткое руководство к красноречию” М.В. Ламаносава (1748), “Краткая логика и риторика для учащихся в Российских духовных училищах” (1803), “Общая риторика” Н.Ф. Кашанскага, “Теория сочинения с хрестоматией” П. Жыцецкага (1895) і інш.).

Менавіта таму пры распрацоўцы тэарэтычных асноў разважання неабходна ўлічваць даныя логікі і рыторыкі. Для таго, **каб стварыць у вучняў найбольш цэласнае ўражанне пра структурныя асаблівасці тэкстаў-разважанняў**, мэтазгодна, на наш погляд, **пазнаеміць** іх з:

- разнавіднасцямі тэзіса (генеральны (асноўная думка сачынення) і другарадныя), патрабаваннямі да яго фармулёўкі (акрэсленасць і нязменнасць) і памылкамі, узнікненне якіх тлумачыцца парушэннем пералічаных вышэй патрабаванняў (неакрэсленнасць тэзіса, падмена тэзіса);
- відамі аргументаў (факты, аўтарытэтныя выказванні, ранней даказаныя палажэнні, законы, маральныя нормы), правіламі іх выкарыстання (праўдзівасць, дастатковасць, адсутнасць супярэчнасцей і лішняй колькасці), і недахопамі, што ўзнікаюць з-за парушэняя пералічаных правіл (памылка ў аснове (г. зн. фактычным матэрыяле), памылка “не вынікае”, супярэчнасць аргументаў і “хто шмат даказвае, той нічога не даказвае”);
- дэманстрацыяй (спосабам лагічнай сувязі паміж тэзісам і аргументамі), прад’яўляемымі да гэтага элемента патрабаваннямі (захаванне характэрных для кожнага віда доказу лагічных сувязей, паўната, г. зн. наяўнасць усіх неабходных элементаў) і такім найбольш распаўсюджаным недахопам, як непаўната доказу;
- відамі доказу (індуктыўны, дэдуктыўны, ад процілеглага, абвяржэнне, раздзяляльны доказ).

Важнае месца ў рыторыцы адводзіцца **пытанню сэнсавага напаўнення ўступнай і заключнай часткі** прамовы. Вельмі важна знайсці удалае беставае рашэнне гэтых структурных кампанентаў, паколькі значэнне ўступа і заключэння вызначаецца "законам першага і апошняга месца", ці "фактарам краю" [1, с. 48]. Яго сутнасць заключаецца ў тым, што лепш за ўсё запамінаецца і робіць уражанне тое, што знаходзіцца ў пачатку і канцы прамовы. На нашу думку, гэтая заканамернасць, можа і не так катэгарычна, але таксама тычыцца ўступа і заключэння сачынення. Таму мэтазгодна **пазнаёміць школьнікаў з некаторымі "ўдалымі варыянтамі" ўступа і заключэння да сачынення-разважання.**

Уступленне: раскрыццё сутнасці вобраза, тэмы, праблемы; кароткая гісторыя распрацоўкі тэмы; характарыстыка эпохі і вызначэнне актуальнасці тэмы, праблемы, вобраза; водгукі аўтарытэтных асоб (дзеячы навукі, культуры ці вядомыя крытыкі); адно ці некалькі пытанняў; цытата з твора ці пераказ яскравага факта; іранічная, юмарыстычная, сатырычная заўвага; афарызм, прыказка, прымаўка; раскрыццё сутнасці пэўнага паняцця.

Заключэнне: падвядзенне вынікаў; паўтарэнне галоўных тэзісаў работы; рытарычнае пытанне; цытата з твора; юмарыстычнае абагульненне; параўнанне, алегорыя; афарызм, прыказка, прымаўка.

Для **вырашэння другой праблемы** (фарміраванне ўменняў і навыкаў ствараць тэксты-разважанні) трэба перш за ўсё **увесці ў падручнікі па мове спецыяльны раздзел, у якім бы змяшчаліся неабходныя тэарэтычныя звесткі і сістэма практыкаванняў**, выкананне якіх садзейнічала б фарміраванню адпаведных уменняў і навыкаў. Зараз падобны матэрыял разгрупаваны па розных раздзелах, адпаведныя практыкаванні носяць дадатковы характар, таму ў настаўнікаў не заўседы хапае часу на іх выкананне.

Аднак з-за аб'ектыўных прычын аб'ём такога раздзела не можа быць вельмі вялікім, таму выпрацоўка неабходных ўменняў і навыкаў можа весціся пад час вывучэння матэрыяла іншых параграфаў. Для гэтага дастаткова так **сфармуляваць заданні для практывавання, каб у іх вучням было прапанавана даказаць нейкія палажэнні,** напрыклад: "*дакажыце, што тэкст належыць да публіцыстычнага стылю*", "*вызначце разнавіднасці складаных сказаў, абгрунтуйце свой пункт гледжання*" і інш.

**Работу па выпрацоўцы неабходных уменняў і навыкаў можна працягваць і на ўроках літаратуры**. Для гэтага неабходна ўвесці ў практыку бягучага кантроля такую форму, як пісьмовыя адказы-разважанні на прапанаваныя настаўнікам пытанні. Прычым форма гэтага разважання (дэдуктыўнае, індуктыўнае, раздзяляльнае, ад процілеглага можа выбірацца вучнем па асабістаму жаданню ці прапаноўвацца настаўнікам адразу). Прытрымлівацца схемы разважання неабходна і пад час вусных адказаў, тым больш што спецыфіка вывучаемых у старэйшых классах літаратурных твораў спрыяе такому спосабу разгортвання думкі.

Менавіта такім чынам, на наш погляд, можа быць вырашана праблема стварэння інтэграванай сістэмы навучання школьнікаў напісанню сачыненняў-разважанняў. Для фарміравання тэарэтычных асноў разважання трэба прыцягваць асобныя палажэнні логікі і рыторыкі, выпрацоўка неабходных уменняў і навыкаў павінна весціся разгрупавана як на ўроках мовы, так і літаратуры.

**Літаратура**

1. Кохтев Н.Н. Риторика. Учеб. пособ. для 8–11-х кл. учеб. заведений с углубл. изуч. гуманит. предметов, а также для лицеев и гимназий. М., 1994.
2. Протчанка В. У. Актуальныя праблемы тэорыі і практыкі навучання беларускай мове. Мінск, 2001.

**Т.М. Смольская**

## АСАБЛІВАСЦІ ПРАЦЫ З ТЭКСТАМ ПА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ НА ЗАНЯТКАХ ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ СА СТУДЭНТАМІ-ХІМІКАМІ

Па праграме, зацверджанай Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь, выкладанне курса беларускай мовы зведзена, па-першае, да мізэрнай колькасці гадзін (34 гадзіны), па-другое, зарыентавана на засваенне тэрміналагічнай лексікі. Відавочна, што “напрацоўваць” матэрыял у гэтым накірунку дапамагае такі трывалы метадычны прыём як праца з тэкстам па спецыяльнасці.

Пераклад як метад навучання, як правіла, дапамагае студэнтам вызначыць, акрэсліць і прадэманстраваць адну з галоўных праблем: не такім простым аказваецца працэс перакладання, як гэта здаецца на першы погляд.